ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 145 (1113) | ЧАЦЬВЕР, 25-га чэрвеня 1930 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менскага АК ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц . . . 30 кап.
3 месяцы . . . 90 „
6 месяцаў . . . 1 р. 80 „
1 год . . . . 3 р. 30 „
АДРАС РЭДАКЦЫІ:
Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ:
Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ X.

Кошт асобнага №—2 кап.

Сёньня адкрываецца XVI зьезд УсеКП(б)

Адбыўся пленум ЦК УсеКП(б)

МАСКВА 25. 25 чэрвеня адбыўся пленум ЦК УсеКП(б). Пленум адобрыў у асноўным запрапанованыя Політбюро тэзісы да 16 зьезду партыі і зацьвердзіў наступную павестку дню:

1. Політычная справаздача ЦК УсеКП(б)—тав. СТАЛІН.
2. Організацыйная справездача ЦК УсеКП(б)—тав. КАГАНОВІЧ.
3. Справаздача дэлегацыі УсеКП(б) ў ВККІ—тав. МОЛАТАЎ.
4. Выкананьне пяцігадовага пляну—тав. КУЙБЫШАЎ.
5. Колгасны рух і ўздым сельскай гаспадаркі—тав. ЯКАЎЛЕЎ.
6. Задачы профсаюзаў у рэконструкцыйны пэрыод—т. ЯКАЎЛЕЎ.

Пленум парашыў адкрыць зьезд 26 чэрвеня. (ТАСС).

* * *

МАСКВА 25. Адчыненьне XVI зьезду УсеКП(б) адбудзецца 26 чэрвеня ў 5 гадзін увечары ў Вялікім тэатры. (ТАСС).

Комсамольскае прывітаньне XVI зьезду УсеКП(б)!

Пад ленінскім кіраўніцтвам ЦК, загартаваная ў барацьбе на два франты, УсеКП(б) сталёвымі калёнамі прыйшла да свайго зьезду

Лепшы падарунак і прывітаньне зьезду—весткі аб гэраічным энтузіязме на франтох соцыялістычных перамог

Сёньня адкрываецца 16 зьезд Усесаюзнай комуністычнай партыі. Прайшоўшыя перад зьездам партыйныя конфэрэнцыі раёнаў, акруг і вобласьцяй і рэспубліканскія зьезды паказалі выключнае адзінадушша моналітнасьць, сталёвую спаянасьць шэрагаў КП(б). Конфэрэнцыі і зьезды з усёй вывыразнасьцю падкрэсьлілі правільнасьць генэральнай лініі партыі і ўмелае бальшавіцкае кіраўніцтва па правядзеньню яе ў жыцьцё з боку цэнтральнага камітэту.

Конфэрэнцыі і зьезды зьявіліся лепшай нагляднейшай дэмонстрацыяй поўнага давер'я ўсёй партыі і мас пролетарыяту свайму цэнтральнаму камітэту.

Конфэрэнцыі паказалі, наколькі значна вырас ідэйна політычны ўзровень, наколькі ўзмацнілася бальшавіцкая закалка партыйных мас. Лепшый сьведкам гэтага зьяўляецца той адзінадушны і руйнуючы адпор, які дадзены ўсімі конфэрэнцыямі і партыйнымі зьездамі усялякім наскокам на лінію партыі як з боку правых опортуністых, так і „левых“ загібшчыкаў.

Цьвёрда стоячы на позіцыі ленінізму, упарта праводзячы лінію на хутчэйшую пабудову соцыялізму ў нашай краіне, усямерна разьвіваючы цяжкую індустрыю, павышаючы яе вядучую ролю, замацоўваючы саюз пролетарыяту з асноўнымі масамі сялянства, па гэтай аснове разгортваючы соцыялістычную рэконструкцыю сельскай гаспадаркі, партыя выкрыла і ўшчэнт разьбіла контрэволюцыйны троцкізм з яго звыш індустрыяльнай тэорыяй і пропаведзямі аб немагчымасьці пабудовы соцыялізму ў нашай краіне.

Пад кіраўніцтвам свайго цэнтральнага камітэту, партыя своечасова накіравала агонь і нанесла руйнуючы ўдар праваму ўхілу.

Шпаркі рост соцыялістычнага сэктару ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі, які выявіўся ў росьце яе валавой продукцыі з 35 проц. у 1925-26 г. да 51,2 проц. у 1929-30 годзе. Выкананьне і перавыкананьне заданьня пяцігодкі па прамысловасьці, бурны размах колектывізацыі, процант якой па зерневых раёнах дасягае да 40-50.—Гэта не толькі сьмяротны ўдар па троцкізму і яго тэорыі аб немагчымасьці пабудовы соцыялізму ў нашай краіне. Гэта руйнуючы ўдар па праваму ўхілу—капітулянцтву перад кулаком тэорыямі раўнаньня на „вузкія месцы“, размовам аб нерэальнасьці ўзятых тэмпаў.

Толькі дзякуючы правільнай лініі нашай партыі, рашучаму і няпрымірымаму змаганьню з усялякага роду адхіленьнямі ад яе, на аснове разгортваньня бальшавіцкіх тэмпаў будаўніцтва мы дабіліся сапраўды вялічэзных дасягненьняў. Мы дабіліся таго, што па важнейшых галінах прамысловасьці, як здабыча каменнага вугля, трактара-будаўніцтва, здабыча нафты, аўтамобілізацыя, пяцігодка, зацьверджаная зьездам саветаў будзе выканана ў тры гады,—па бэнзіну і цэманту ў 3 з пал. гады. Па чыгуну, сталі, жалезу, паперы і картону—у 4 г.

Найбольш яркімі, жывымі паказчыкамі ў галіне індустрыялізацыі зьяўляецца пуск Растоўскага сельмашу, які будзе выпускаць у год машын больш, чым 900 заводаў дарэволюцыйнай Расіі. Сталінградзкі трактарбуд будзе выпушчаць у год 50 тысяч трактароў „50 тысяч трактароў—гэта 50 тысяч снарадаў, якія разбураць стары буржуазны сьвет“.

Цьвёрды і няўхільны курс на індустрыялізацыю краіны, замацаваньне саюзу пролётарыяту з асноўнымі масамі сялянства на базе вытворчай змычкі, стварылі неабходныя ўмовы для шпаркіх тэмпаў соцыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі, забясьпечылі карэнны паварот сярэдняга сялянства на шлях колектывізацыі.

У выніку гэтага на сёнешні дзень адна трэцяя частка сялянскіх двароў колектывізавана. Мы ў гэтым-жа годзе будзем мець асноўную масу таварнага хлеба з соцыялістычнага сэктару сельскай гаспадаркі. Адны савгасы дадуць 5.800.000 тон хлеба.

Гэтыя посьпехі дасягнуты дзякуючы няўхільнаму праводзеньню ленінскага прынцыпу аб добраахвотнасьці ўступленьня ў колгасы і рашучаму своечасоваму выпраўленьню антысерадняцкіх „левых“ перагібаў і скажэньняў у колгасным будаўніцтве.

Пасьлядоўна ажыцьцяўляючы правільную нацыянальную політыку, партыя дабілася значных посьпехаў у галіне гаспадарчага і культурнага ўздыму нацыянальных рэспублік. Прыгнечаныя царскім урадам як экономічна так і нацыянальна, цяперашнія савецкія нац. рэспублікі з дапамогаю ўсяго Савецкага Саюзу дасяглі агромністых посьпехаў у галіне гаспадарчага ўздыму і будаўніцтва нацыянальнай пролетарскай культуры.

Выразам гэтых посьпехаў зьяўляюцца тыя клясавыя зрухі ў краіне, якіх партыя дабілася ў выніку энэргічнага ажыцьцяўленьня ленінскай лініі; выключнага пад'ёму актыўнасьці пролетарыяту, размаху соцспаборніцтва, бурнага росту ўдарніцтва, новыя сотні тысяч пролетарыяў, якія ўвайшлі ў партыю Леніна, карэнны і гістарычны паварот серадняцкіх мас на шлях колектывізацыі.

Як вядома, іменна гэтыя гістарычныя клясавыя зрухі дазволілі партыі перайсьці ад політыкі абмежаваньня кулацтва да ліквідацыі кулацтва, як клясы на базе суцэльнай колектывізацыі („КП“).

Шлях, па якому мы ідзем, упарта будуючы соцыялізм у нашай краіне зьвязаны бязўмоўна з вялікім цяжкасьцямі. Гэтыя цяжкасьці месьцяцца ў абвостранай міжнароднай абстаноўцы, ліхаманкавым супраціўленьні кулака, у нашых харчовых недахопах, у дрэннай наладжанасьці рабочага забесьпячэньня і інш.

Аб усіх гэтых цяжкасьцях партыя ведае, ясна сабе ўяўляе іх прычыны і тым больш рашуча, як і раней будзе праводзіць лінію на індустрыялізацыю краіны, на соцыялістычную перабудову сельскай гаспадаркі,—як адзіна верны шлях да хутчэйшай пабудовы соцыялізму. Партыя тым больш рашуча будзе біць па правых опортуністых, якія об'ектыўна зьяўляюцца кулацкімі агентамі ўнутры партыі і сваёй ідэолёгіяй і практыкай імкнуцца ўзаконіць гэтыя цяжкасьці.

Праводзячы далей няўхільнае змаганьне за чыстату ленінскай лініі мы абавязаны памятаць, што галоўнейшай умовай ажыцьцяўленьня задач якія выходзяць з генэральнай лініі зьяўляецца няпрымірымая барацьба з усялякімі ўхіламі: з „левымі“ загібамі, якія ўзмацняюць позіцыі правых у іх барацьбе супроць лініі партыі, з правай небясьпекай, якая харчуецца ў дробнабуржуазным асяродзьдзі і застаецца галоўнай небясьпекай на даным этапе соцбудаўдаўніцтва. Вопыт двухгадовай барацьбы з асаблівай выразнасьцю гэта падкрэсьліў. Гэта падцьвярджаецца і тым характарам вылазак на партыйных конфэрэнцыях, якія мелі месца з боку правых. На глебе цяжкасьцяў скарыстоўваючы асобныя памылкі месц правыя опортуністыя ў шэрагу мейсц імкнуліся ўзьняць свой падкулачны голас. Наскокі на лінію партыі з паклёпніцкімі абвінавачваньнямі ЦК і прымірэнчыя да іх адносіны павінны і далей атрымоўваць руйнуючы адпор.

На матар'ялах і пастановах XIII зьезду КП(б)Б і XVI зьезду УсеКП(б) комсамольскія організацыі павінны выхоўваць свае шэрагі. Неабходна будзе як мага шырэй прасунуць у масы рашэньні XVI зьезду УсеКП(б), наладзіць глыбокую іх прапрацоўку з тым, каб кожны комсамолец знаў тыя задачы, што вызначыў зьезд, каб кожная комсамольская ячэйка на любым вучастку соцыялістычнага будаўніцтва вяла самую энэргічную работу па ператварэньню пастаноў у конкрэтныя посьпехі будаўніцтва.

Наперакор балбатні і „прадсказаньням“ правых опортуністых партыя моналітнымі калёнамі з вялізарнейшымі посьпехамі ва ўсіх галінах соцбудаўніцтва прышла да зьезду.

Слухай партыя! Гаворыць твая зьмена

Організацыяй новых брыгад, комсамольскіх ячэек, падрыхтоўкай да ўборачнай кампаніі Магілеўскі комсамол вітае 16 зьезд УсеКП(б)!

Комсамол Магілеўшчыны разгарнуў работу да 16 зьезду УсеКП(б)

ПА ГОРАДУ:

— Ячэйка будаўнікоў організавала адну ўдарную брыгаду імя 13 зьезду КП(б)Б і другую імя 16 зьезду УсеКП(б), перадала двух лепшых комсамольцаў у КП(б)Б, уцягнула 50 чалавек рабочых ва ўдарныя брыгады. Ячэйка „Вадасьвятло“ організавала 2 ўдарныя брыгады.

— Шорная фабрыка і друкарня цалкам абвясьцілі сябе ўдарнікамі імя 13 зьезду КП(б)Б, організавана адна ўдарная брыгада імя 16 партзьезду і 5 комсамольцаў перададзены ў КП(б)Б (шорная фабрыка).

— Магвалакнабуд організаваў ударную брыгаду з усіх цэхаў з лікам 300 чалавек ударнікаў.

— Профшкола мэталістых абвясьціла ўсе цэхі ўдарнымі і перадала 17 лепшых профшкольцаў у комсамол.

— На заводзе „Лекерт“ організаваны 2 ударныя брыгады, 7 комсамольцаў перададзены ў партыю і 9 маладых рабочых прыняты ў комсамол.

— У ячэйцы пры фабрыцы „Барацьба“ (Шклоў) комсамольцы-ударнікі распрацавалі ўсе тэзісы пры 100 процантнай яўцы на сходы. Прамфінплян даведзен да кожнага рабочага.

У КОЛГАСАХ:

— У колгас „Чырвоны Ўсход“ (Чачэвічы) пры распрацоўцы тэзісаў каля 40 чалавек батрацка-бядняцкай і серадняцкай моладзі падалі заявы аб прыняцьці іх у КСМ. Організавана новая ячэйка. Акрамя распрацоўкі тэзісаў Якаўлева і пасылкі 8 чалавек з райактыву ў ячэйкі для іх распрацоўкі, Чачэвіцкая організацыя да 16 зьезду нічога не зрабіла.

— Пры распрацоўцы тэзісаў у колгасе „Іскра“ (Шклоў) організавана комсамольская ячэйка з 12 чалавек.

— Княжыцкая ячэйка (Магілеў) у парадку падрыхтоўкі да 16 зьезду організавала да ўборачнай кампаніі 3 брыгады: па рамонту інвэнтара, брыгада касцоў і брыгада жнеек (выключна з дзяўчат), а піонэратрад—3 брыгады: па вязцы снапоў і складаньню іх у копы.

Комсамол Магілеўшчыны павінен і надалей, авалодаўшы ўдарнымі тэмпамі работы, ліквідаваць прарывы і мобілізаваць усе свае сілы на пасьпяховую падрыхтоўку і правядзеньне ўборачнай кампаніі, выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну і на выкананьне пяцігодкі ў 4 гады, што зьявіцца найлепшым падарункам 16 зьезду УсеКП(б).

Б. Аіўшыц.

Рапартуючы XVI зьезду УсеКП(б), рабочыя і служачыя Менскага вузла МББ чыгункі заяўляюць:

Чыгуначны пролетарыят Менскага вузла рашуча вядзе перабудову старога бюрократычнага апарату, ператвараючы ў новую сыстэму ўпраўленьня, якая дасьць магчымасьць форсаваным тэмпам транспарту выйсьці з „вузкага месца“ ў прамысловасьці і паскорыць тэмпы соцыялістычнага будаўніцтва.

Для хуткага разьвіцьця соцбудаўніцтва і выкананьня пяцігадовага пляну ў тры гады на транспарце, пролетарыят, пад кіраўніцтвам партыі і профсаюзаў, уступіў у соцспаборніцтва і ўдарніцтва з 1 чэрвеня 1929 году, якім было ахоплена 2215 чыг. У выніку соцспаборніцтва мы маем значныя дасягненьні.

Выкананы вытворчыя заданьні па рамонту вагонаў на 100 проц. Па зьніжэньню сабекошту на рамонт вагонаў атрымалі эканомію—5032 руб.

Супроць мінулага опэрацыйнага году па ўсіх відах рамонту далі зьніжэньне на 20,15 проц.

У правядзеньні колектывізацыі вузел прыняў шэфства над Грэскім і Смалявіцкім раёнамі Менскай акругі.

На сродкі рабочых чыгункі вакуплены тры трактары.

Мы сёньня прыпадносім наш падарунак XVI партыйнаму зьезду—10 адрамантаваных таварных вагонаў.

Няхай жыве правадыр рабочае клясы—комуністычная партыя!

Няхай жыве XVI партзьезд УсеКП(б)!

Няхай жыве сусьветная рэволюцыя!

За генэральную лінію партыі

Комсамол, колгасная моладзь, дарослыя колгасьнікі дэмонструюць сваю жалезную згуртаванасьць вакол ленінскай партыі, паказваюць свае дасягненьні 16-му партыйнаму зьезду

Сяўба ў БССР канчаецца.—Саўгасы перавыканалі павялічаны плян на 9,5 проц. Колгасы вельмі добра справіліся са сваёй задачай, перавыканаўшы свае заданьні.—Індывідуальны сэктар ужо засеяў свой леташні яравы клін. Плошча засеваў на 15 чэрвеня пашырана на 5 проц.

За ўдарныя тэмпы ў 100 проц. выкананьня севу, падрыхтоўцы да ўборачнай і асеньняй пасеўкампаніі

Шаснаццаты вітаем перамогамі

З розных колгасаў Савецкай Беларусі ў рэдакцыю штодзённа паступаюць рапарты і прывітаньні 16 партыйнаму зьезду.

Маладыя колгасьнікі комсамольцы, сумесна з астатнімі рапартуюць аб тых дасягненьнях, якіх яны дабіліся ў клясавай барацьбе пад адзіна правільным кіраўніцтвам комуністычнае партыі.

У сваіх рапартах яны паказваюць на ўсю нікчэмнасьць і шкоднасьць як асабліва правага ухілу так і „левага“ антысераднякіх перагібаў і яшчэ раз на грунце сваіх посьпехаў падцьвярджаюць адзіна правільную генэральную лінію партыі ў соцыялістычнай рэконструкцыі усёй народнай гаспадаркі і абяцаюць зьезду прыкласьці ўсе сілы каб выканаць тыя задачы, якія вырашыць 16 партыйны зьезд.

РАПАРТУЮЦЬ:

Колгас імя Валадарскага

Запольскага сельсавету, Плешчаніцкага раёну. Плян вясеньняга севу колгас выканаў на 113 проц., г. зн. засеяна 120,5 га бульбы, 35 га пшаніцы, 80,5 га аўсу, 14 га канюшыны і іншых культур.

У час сяўбы увесь колгас абвясьціў сябе ўдарным. Комсамольцы паказалі вялікі прыклад соцыялістычнай працы ў час сяўбы. Так, напрыклад комсамолка-ударніца растрэсла гною за дзень на 1,25 га, г. зн. за 5 чалавек. Многія аратыя выконвалі заданьні на 150 процантаў.

У сучасны момант колгас узяўся за ворыва папару. Узарана 21 га. Прыступлена да будаўніцтва сьвінарнікаў і стайняў. Ідзе ўдарная работа па падрыхтоўцы да ўборкі ўраджаю.

Колгас імя Карла Маркса

Вясеньняя пасеўная кампанія ў колгасе прашла з вялікім посьпехам. Плошча пад пасевамі сёлета павялічылася ў тры разы ў параўнаньні з мінулым годам.

Лік колгасьнікаў, а таксама і плошчы зямлі за гэты год павялічыўся ў два з паловай разы. Усяго сёлета засеяна 380 гэктараў пад ярыну. У хуткім часе колгас прыступае да будаўніцтва вялізарнага сьвінарніка. Заканчваецца падрыхтоўка да ўборачнай кампаніі.

Колгас памяці Леніна Самахвалавіцкага раёну Меншчына

У час вясеньняга севу ўся комсамольская ячэйка была разьбіта на ўдарныя брыгады, дзякуючы чаму сеў быў закончан на тыдзень раней супроць намечанага пляну.

„Толькі дзякуючы нашым комсамольцам, мы здолелі вясновую сяўбу правесьці па-бальшавіцку“,—кажуць колгасьнікі па адрасу комсамольскай ячэйкі. Зараз ячэйка перакінула ўсе свае сілы на падрыхтоўку да ўборачнай кампаніі.

Агульны сход комсамольскай ячэйкі, сумесна з колгаснай моладзьдзю колгасу „Полымя“, рапартуе:

Вярхоўнаму органу партыі Леніна —16 зьезду ўсесаюзнай комуністычнай партыі бальшавікоў—сход комсамольскай ячэйкі і моладзі колгасу „Полымя“ шле шчырае комсамольскае колгаснае прывітаньне.

Наперакор контррэволюцыйным троцкістым, праваму опортунізму і „левым“ загібам, наш колгас, як і астатнія колгасы Савецкага Саюзу, пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі, яе бальшавіцкага ЦК дабіўся вялізарных посьпехаў. Так, плян вясеньняга севу перавыканан на 10 проц. Па паасобных культурах пляны перавыкананы на 25-30 проц. Уся комсамольская ячэйка, у сувязі з надыходам уборачнай кампаніі, абвясьціла сябе ўдарнай. Організаваны ўдарныя брыгады з комсамольцаў-колгасьнікаў. Бярэм на сябе абавязак зьнішчыць прагулы і спазьненьні на працу, падняць вытворчасьць працы на 8 проц. Бярэм на сябе абавязак організаваць дапамогу індывідуальным бядняцка-серадняцкім гаспадаркам у часе ўборачнай асеньняй пасеўнай кампаніі.

Рапартуюць студэнты Рагачоўскага пэдтэхнікуму

Студэнты Рагачоўскага пэдтэхнікуму ў колькасьці 62 чалавек адбываюць сельска-гаспадарчую практыку ў колгасе „Перамога“. Усе студэнты разьбіты на 6 брыгад, паміж якімі разгорнута соцспаборніцтва. Апрача працы па ўмацаваньню колгасу і па выкананьню вясеньняй пасеўнай кампаніі студэнтамі разгорнута культурна-палітычная праца сярод колгасьнікаў, а таксама сяроў бядняцкіх і серадняцкіх мас некалгасьнікаў. Організаваны чырвоны куток, політгурток, гурток па вывучэньню статуту і програмы комсамолу і г. д.

Колгас „Чырвоны Маяк“ Случчына

Наш колгас з'організаваўся сёлета і налічвае 28 гаспадарак. Але, ня гледзячы на шэраг цяжкасьцяй, мы ня толькі выканалі, але перавыканалі пасеўны плян. Так, напрыклад, плянам было прадугледжана засеяць 140 га, засеяна-ж 161 га. Зараз пачалася падрыхтоўка да ўборачнай кампаніі. Утвораны брыгады па касавіцы.

Колгас „Зара“ Пухавіцкага раёну Меншчына

У першых лічбах чэрвеня наш колгас закончыў вясеньнюю пасеўную кампанію. Засеяна 175 га яравых. Комсамольская ячэйка ў час правядзеньня месячніку „організацыі працы ў колгасе“ разам з колгасьнікамі ўтварыла нядзельнік і засеяла 35 га аўсу.

К XVI партыйнаму зьезду мы падыходзім з шэрагам дасягненьняў, як у гаспадарчым, так і культурным будаўніцтве. Так, напрыклад, пасеўная плошча з кожным годам усё пашыраецца, ураджайнасьць павышаецца ў параўнаньні з індывідуальнымі гаспадаркамі. Няпісьменнасьць сярод колгасьнікаў ліквідавана.

Нова-Дамановіцкі колгас,

Дзякуючы сваечасоваму скончэньню севу і ўдарнай рабоце па падрыхтоўцы да ўборачнай кампаніі, а таксама даасеньняму севу, за апошні час у колгас пачалі паступаць шэраг заяў ад батракоў і бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Прынята 12 гаспадарак.

Папярэднія вынікі бальшавіцкай сяўбы ў БССР*)

Цалкам сьцьвярджаюць правільнасьць генэральнай лініі партыі

На сёньнешні дзень яшчэ няма канчатковых выніковых даных. Весткі, якія паступілі з акруг, гавораць аб выкананьні 95 проц. пашыранага пасеўнага пляну. Гэта сьведчыць аб тым, што к цяперашняму моманту веснавая сяўба па БССР ужо заканчваецца.

Адзін той факт, што на 15 чэрвеня засеяна 2263000 гэктараў яравога кліну, супроць 2151000 гэкт. усяе плошчы яравога кліну, засеянага летась у веснавую кампанію, ужо гаворыць аб тым, што ўсякія кулацкія гутаркі і прадраканьні правых опортуністых аб недасеве разьбіты ўшчэнт. Пашырэньне на 15 чэрвеня пасеўнае плошчы на 5 проц. у параўнаньні з плошчай яравога кліну мінулага году, мае асабліва вялізарнае значэньне.

Вялізарнейшым дасягненьнем веснавой сельска-гаспадарчай кампаніі зьяўляецца тое, што соцыялістычны сэктар заняў 20 проц. усіх яравых пасеваў, супроць 4 проц. У мінулым годзе. Беларускія саўгасы паказалі прыклад сапраўднай баявой работы і разуменьня задач, ускладзеных на іх партыяй. Яны перавыканалі свой пасеўны плян на 9,5 проц. і пашырылі пасеўную плошчу мінулага году на 34 проц.

Даскананa справіліся з сяўбой беларускія колгасы. Ня гледзячы на рад труднасьцяй (зацяжкі з зямляўпарадкаваньнем, кепская організацыя працы, недахват цягавай сілы і г. д.), ня гледзячы на падрыўную работу і моцную агітацыю кулацкіх элемэнтаў, колгасы першымі скончылі сяўбу ў большасьці раёнаў, перавысіўшы свае пасеўныя пляны.

Сёлетняя бальшавіцкая сяўба карэнным чынам зьмяніла твар беларускай вёскі. У той час, як летась у гэту пару ў БССР колгасы аб'ядналі толькі 2 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак і займалі 3,8 проц. усяе пахаці, яны зараз ужо яднаюць 12 проц. бядняцка-серадняцкіх двароў і займаюць 16 проц. пахаці.

Той факт, што сёлета соцыялістычны сэктар БССР дасьць пролетарскай дзяржаве прыкладна 25-30 проц. таварнай прадукцыі ўсёй сельскай гаспадаркі рэспублікі,—зьяўляецца вялізарным дасягненьнем партыі і рабочае клясы.

Сёлетняй пасеўнай кампаніяй колгасы яшчэ раз пацьвердзілі сваю жыцьцяздольнасьць, абвергнулі праваўхіліцкія тэорыі і плёткі, практычна даказалі правільнасьць генэральнай лініі партыі. Беларусь, ступень мэханізацыі колгасаў, якое нязьмерна ніжэйшая, чым у іншых збожжавых раёнах Савецкага Саюзу, асабліва характэрна ў гэтых адносінах. Пасьпяховае правядзеньне сяўбы беларускімі колгасамі на практыцы пацьвярджае правільнасьць ленінскай думкі аб вялізарнейшых перавагах нават проста складаньня сялянскіх сродкаў вытворчасьці.

Індывідуальны сэктар, які займае яшчэ значнае месца ў БССР, з прычыны цэлага раду памылак і скажэньняў партыйнае лініі на мясцох, у прыватнасьці пры адводзе зямель, забесьпячэньні сродкамі вытворчасьці і г. д. прыступіў да сяўбы са спазьненьнем. Аднак, дзякуючы прынятым партыяй рашучым мерам па ліквідацыі скажэньняў, якія мелі месца ў адносінах індывідуальнікаў—беднякоў і серадня-коў, ня гледзячы на кулацкія манэўры і агітацыю за зрыў сяўбы індывідуальнікамі,—індывідуальны сэктар сяўбу разгарнуў і ў асноўным яе ўжо з посьпехам заканчвае.

Плошча пасеваў гэтых гаспадарак на сёнешні дзень ужо ня ніжэй плошчы мінулага году. Гэта яскрава пацьвярджае, што гутаркі аб „размычцы“ рабочае клясы з бядняцка-серадняцкім сялянствам шыты белымі ніткамі. Сапраўднасьць гаворыць аб тым што саюз з серадняком ня толькі не парушаецца, а з кожным днём яшчэ больш умацоўваецца, што політыка партыі ў вёсцы зусім правільная і не адчувае патрэбы ні ў якіх рэвізіях.

Перавыкананьне пляну па прапашных культурах зьяўляецца вельмі важным момантам для БССР, як для раёну асноўнай сьвінагадоўлі. Не малое значэньне мае факт значнага пашырэньня плошчы пад асноўныя сеяныя травы. Пасевы пад канюшыну, напрыклад, пашыраны на 50 проц.

Урэшце, трэба адзначыць, што веснавая пасеўная кампанія глыбока закранула пытаньні жывёлагадоўлі ў БССР і асабліва сьвінагадоўлі. Беларусь паставіла перад сабой конкрэтную задачу—ліквідаваць прарывы ў галіне жывёлагадоўлі і форсаваць яе разьвіцьцё, у першую чаргу сьвінагадоўлю.

Паданая характарыстыка папярэдніх вынікаў веснавой сяўбы ў БССР на практыцы пацьвярджае правільнасьць генэральнай лініі партыі. Пераход 87 тысяч дробных сялянскіх гаспадарак на шлях будаўніцтва буйной соцыялістычнай гаспадаркі, які адбыўся за мінулы год, з посьпехам праведзеная колгасамі веснавая сяўба —зьяўляецца моцнай асновай для далейшага прасоўваньня на гэтым шляху, да разгортваньня патрэбных тэмпаў колгаснага будаўніцтва, ажыцьцяўленьня дырэктывы партыі аб ліквідацыі кулацтва, як клясы, на базе суцэльнай колектывізацыі.

Трэба ўлічыць усе памылкі, дапушчаныя у практычнай рабоце па веснавой пасеўнай кампаніі.

У прыватнасьці, трэба максымум увагі зараз аддаць будаўніцтву сьвінагадоўчых гаспадарак, якія ў БССР павінны адыграць ролю збожжавых фабрык, у свой час разгорнутых у збожжавых раёнах Савецкага Саюзу.

Ф. Н. Рачыцкі.

*) Артыкул зьмяшчаецца ў скарочаным выглядзе.

да XVI партзьезду

Эконамічная аснова соцыялізму

„Утварэньне буйнай соцыялістычнай прамысловасьці—асновы соцыялістычнай рэконструкцыі народнай гаспадаркі, здольнай рэорганізаваць сельскую гаспадарку, павысіць абароназдольнасьць краіны пролетарскай дыктатуры і вызваліць народную гаспадарку СССР ад залежнасьці ў адносінах капіталістычных краін.—зьяўляецца важнейшай задачай ў справе пасьпяховай пабудовы соцыялістычнай грамады“—так вызначаюць тэзісы тав. Куйбышава к XVI партзьезду ролю і значэньне буйнай індустрыі.

Гэтая ацэнка цалкам выходзіць з ленінскіх поглядаў на буйную соцыялістычную прамысловасьць, якая зьяўляецца „адзіна магчымай эконамічнай асновай соцыялізму“

Якія-ж асноўныя вынікі і падсумаваньні, якіх мы дасягнулі ў выніку хуткі тэмпаў індустрыялізацыі.

Савецкае машынабудаўніцтва цьвёрда становіцца на ўласныя ногі. Продукцыя машынабудаўніцтва за тры гады павялічылася з 439 млн. рублёў у 1927-28 г. да 1.200 млн. рублёў у 1929-30 г. Буйнейшую ролю для вызваленьня народнай гаспадаркі ад чужаземнай залежнасьці адыграла разьвіцьцё шэрагу новых галін вытворчасьці, якіх ня ведала капіталістычная Расія. Удзельная ўвага продукцыі гэтых галін вытворчасьці ў бягучым годзе (у агульнай продукцыі машынабудаўніцтва) склала каля 17 проц. У выніку-доля імпортнага абсталяваньня, якая складала да вайны ня меньш 50 проц., у бягучым годзе складае толькі 23 проц., ня гледзячы на вялізарны размах капітальнага будаўніцтва, які ня ідзе ні ў якае параўнаньне з даваенным і які прад'яўляе выключныя патрабаваньні да савецкага машынабудаўніцтва. З гэтага відаў чны вынікі правільнай політыкі партыі, высунуўшай у якасьці аднэй з важнейшых задач пасіленьне нашай незалежнасьці ад гаспадаркі капіталістычных краін.

Разьвіцьцё цяжкай прамысловасьці, у сваю чаргу, прадзначыла размах соцыялістычнай рэконструкцыі сельскага гаспадаркі, дапамагаючы пераводу яго на рэйкі аграмаджаньня і мэханізацыі, забясьпечыла рашаючы паварот асноўнай масы сялянства да соцыялізму, зрабіла магчымым на базе суцэльнай колектывізацыі ліквідацыю кулацтва як клясы. Продукцыя с.-г. машынабудаўніцтва з 107 млн. рублёў у 1927-28 г. павысіліся да 400 млн. р. у 1929-30 г. **павялічыўся супроць 1913 году амаль у пяць раз.** Блізкі да выкананьня мары Уладзімера Ільліча аб 100 тысячах трактароў, пры наяўнасьці якіх ён прачуваў рашучы паварот асноўных мас сялянства да соцыялізму.

Дзевяноста з лішкам тысяч трактароў (у 10—мільённых умоўных адзінак) барадзяць савецкія палі... Каля паловы гэтай колькасьці выраблена на савецкіх заводах. У будучым годзе продукцыя с.-г. машынабудаўніцтва будзе даведзена да 800 з лішкам млн. рублёў, а ў 1932-33 годзе лік трактароў пераўліць за 300 тыс. штук, магутнасьцю звыш 8 млн. конскіх сіл.

Мы ўжо пасьпяхова вырашаем збожжавую проблему; рост цяжкай індустрыі, гіганцкае разьвіцьцё с.-г. машынабудаўніцтва і трактарбудаўніцтва —асноўны шлях для хутчэйшай ліквідацыі напружанага харчавога становішча разьвіцьця сыравіннай базы, рашэньня проблемы таварнага голаду. **Толькі на гэтым шляху. усьлед за вырашэньнем збожжавай проблемы, будзе вырашана проблема сыравіны і забясьпечана разьвіцьцё жывёлагадоўлі.**

З хуткім ростам індустрыі расьце і мацнее гегемон рэволюцыі—рабочая кляса, паляпшаецца яе матэр'яльны і культурны добрабыт. За мінулы з XV зьезду пэрыяд у прамысловасьць уліласся звыш паўмільёна рабочых, заработная плата павысілася на 3 проц.

Творчы энтузіязм рабочае клясы, магутны размах соцыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва зьявіліся адным з рашаючых фактараў дасягнутых посьпехаў. І толькі **недахопамі організацыі** вытворчасьці, адсутнасьцю патрэбнай увагі магчыма ў асноўным вытлумачыць адставаньне прамысловасьці ў галіне якасных паказчыкаў—недастатковае зьніжэньне сабекошту, нездавальняючая якасьць продукцыі.

Наша соцыялістычнае будаўніцтва праходзіць ва ўмовах жорсткага супраціўленьня краін капіталізму, шалёнага цкаваньня Савецкага Саюзу з боку сусьветнага імпэрыялізму. Пагэтаму павышэньне абароназдольнасьці СССР зьяўляецца аднэй з цэнтральных задач і абавязковай умовай, якая забясьпечвае магчымасьць мірнага будаўніцтва. Адным з рашаючых фактараў, які вызначыць посьпех ваюючых бакоў, зьяўляецца магутнасьць вытворчага апарату, узровень разьвіцьця тэхнікі. Ці патрэбна гаварыць аб тым, што бурны рост нашай прамысловасьці, павышэньне яе тэхнічнага ўзроўню, разьвіцьцё энэргетычнай базы, мэталюргіі, машынабудаўніцтва, хэмічнай прамысловасьці, будаўніцтва аўтомобільных і трактарных гігантаў, посьпехі ў галіне ўласнага авіобудаўніцтва, непамерна ўмацавалі і павысілі абароназдольнасьць нашай краіны. У выніку правільнай ленінскай політыкі партыі і на гэтым важнейшым вучастку фронту мы добра ўмацаваліся.

Тэзісы тав. Куйбышава чотка намячаюць пэрспэктывы далейшага разьвіцьця соцыялістычнай прамысловасьці. Рашэньне задач намечанных у тэзісах, бязумоўна і прывядзе нас да яшчэ большых посьпехаў на шляху індустрыялізацыі краіны, колектывізацыі сельскай гаспадаркі, аслабленьня нас ад чужаземнай залежнасьці і павышэньня абароназдольнасьці нашай краіны.

Выкананьне пяцігодкі ў 4 гады, далейшыя крокі на шляху рэалізацыі—лезунг—„дагнаць, а затым і перагнаць“ перадавыя капіталістычныя краіны,—такавы баявыя задачы, над вырашэньнем якіх прыдзецца працаваць не пакладаючы рук.

Толькі ў далейшай упартай і бязьлітаснай барацьбе з правым опортунізмам, як галоўнаю небясьпекай, і „левымі“ заскокамі можа быць і будзе забясьпечана вырашэньне задач соцыялістычнага будаўніцтва, якія стаяць перад намі.

І. Коган.

Рахунак, які чакае аплаты

У Магілеўшчыне прамфінпляну не давялі да рабочых

Масавая праверка давядзеньня прамфінпляну да варштата, праведзеная па 20 прадпрыемствах гораду Магілева і двух прадпрыемствах у акрузе (папяровая фабрыка „Спартак“ і завод „Ільліч“), выявіла, што і на сёньнешні дзень па шэрагу фабрык і заводаў прамфінплян не даведзен да кожнага рабочага.

Работа гэтая праводзілася на мясцох групамі „лёгкай кавалерыі“, ударнікамі і вытворчымі камісіямі. **Дрэнна была разгорнута масавасьць гэтай работы на шорнай фабрыцы, заводзе „Зорка“, Магвалакнабуду ў першай скурарцелі**, дзякуючы халатнасьці таварышоў, пасланых на гэтыя прадпрыемствы ў якасьці арганізатараў гэтай работы.

7 прадпрыемстваў рабочыя каторых ня ведаюць аб прамфінпляне

Найбольш буйныя прадпрыемствы Магілеўшчыны: **«Адраджэньне», „Лекерта“, рымарная фабрыка, алейны завод, «Зорка», Магвалакнабуд** і шэраг іншых прамфінпляну **да рабочых не давялі.** На швэйнай фабрыцы, хлебазаводзе, у цэрабкоопе, працколектывах, вадасьвятле, мэблявай фабрыцы прамфінплян **не даведзен нават і да цэху.**

Зусім слаба праводзіцца работа па популярызацыі сярод рабочых асноўных паказчыкаў прамфінпляну: якасьці, колькасьці зьніжэньня сабекошту і інш. Мэтадамі популярызацыі і агітацыі за прамфінплян шляхам вывешваньня лёзунгаў, зводак у паасобных цэхах, ля варштатаў усюды дрэнна карыстаюцца за выключэньнем цукеркавай фабрыкі імя 10-годзьдзя Кастрычнікавай рэволюцыі.

Шмат на якіх прадпрыемствах рабочыя ня былі ўцягнуты ў разьмеркаваньне прамфінпляну па цэхах. На заводзе „Адраджэньне“ нават партыйна-комсамольская арганізацыя і завком не зацікавіліся гэтым пытаньнем. У працколектыве „Вадасьвятло“ развал дзьвёх брыгад прашоў міма комсамольскай і партыйнай грамадзкасьці. Самі комсамольцы, партыйцы ў большасьці не зьяўляюцца ўдарнікамі.

Цукеркавая—прыклад для іншых

Выключэньнем і прыкладам для іншых па давядзеньню прамфінпляну да кожнага рабочага зьяўляецца цукеркавая фабрыка. Яна, дзякуючы сталай популярызацыі прамфінпляну сярод рабочых, дабілася перавыкананьня яго па выпуску продукцыі на 1,41 проц.; вытворчасьць працы павышана супроць пляну на 10,85 проц.; заработная плата аднаго рабочага павысілася супроць пляну на 9,10 проц.: сабекошт зьніжан больш плянавых меркаваньняў на 9,1 проц; брак зьніжан на 4,7 проц.

На фабрыцы на відным месцы вывешваюцца паказчыкі штодзённых выпрацовак паасобных брыгад, комун і цэхаў. Дошка адлюстроўвае штодзённыя посьпехі і паражэньні барацьбы за прамфінплян.

15 і 1 чысла кожнага месяцу лічбы сумуюцца, выводзіцца процант выкананьня прамфінпляну.

Зусім нездавальняюча пастаўлена работа па асьвятленьню вузораў барацьбы за прамфінплян на Магілеўскіх прадпрыемствах у газэце „Комунар Магілеўшчыны“, што тлумачыцца адсутнасьцю работы з рабкорамі.

С. Саўрэй.

Сёньня адчыніцца XVI Зьезд ленінскай партыі! Сёньня і на працягу ўсёй работы зьезду рабочая кляса, колгасьнікі і ўсе працоўныя Уралу, Закаўказьзя, Масквы, Ленінграду, Донбасу, Украіны, Беларусі—уся краіна будзе даваць справаздачу аб сваіх перамогах на франтох будаўніцтва соцыялізму.

Комсамольцы і рабочыя фабрыкі „Везувій“, „Спартак“, прадпрыемстваў Магілеўшчыны, „Беларуска“, Шклозаводу „Пролетары“, вы ў даўгу перад партыяй, вы не як сьлед узброіліся лічбамі пяцігодкі, лічбамі барацьбы за соцыялізм, у вас не даведзен прамфінплян да кожнага рабочага, до кожнага варштату. Рахунак чакае аплаты. Вы яго павінны аплаціць упартай барацьбой за кожны паказчык вашых прамфінпляпаў.

Лавінай комсамольскага энтузіязму і энэргіі, трэба змыць ганебную пляму прарываў. Комсамольцы і рабочыя ўперадзе ідучых прадпрыемстваў мэтадам „грамадзкага буксіру“ дапамажэце адстаючым стаць разам з вамі перадавымі.

Завод „Бальшавік“ выконвае сваё абяцаньне

Менскі завод «Бальшавік» ідзе па шляху ліквідацыі вытворчых прарываў, якія мелі месца ў першых двух кварталах 1929-30 гаспадарчага году. Рабочы колектыў пасьпяхова выконвае дадзенае абяцаньне 13 партыйнаму зьезду КП(б)Б.

Другая пяцідзёнка з 5 па 10 чэрвеня дае наступныя паказчыкі:

ПА ХРОМАВЫМ ЦЭХУ:

Па замочцы скур плян выканан на 101,72 проц., па выпрацоўцы на 93,10 проц у цэнасным выражэньні на 115,58 проц.

ПА ЧЫРВОНАДУБНЫМ ЦЭХУ.

Па замочцы на 106 проц, па выпрацоўцы на 148,58, а ў цэнасным выражэньні на 124 проц.

ПА ЛАЙКАВЫМ ЦЭХУ.

Па замочцы 100 проц., па выпрацоўцы на 100,32 проц., а ў цэнасным выражэньні на 140,38 проц.

ПА ЖЕЛАЦІННЫМ ЦЭХУ:

Па выпрацоўцы клею дасягнулі 73,24 проц., па выпрацоўцы сала—67,79 проц., а ў цэнасным выражэньні — 73,02 проц.

Па ўсім заводзе: па замочцы плян выканан па 102,42 проц., па выпрацоўцы на 110,12 проц., у цэнасным выражэньні — на 117,47 проц.

Паасобныя цэхі яшчэ адстаюць ад 100-процантнага выкананьня прамфінпляну, адстаюць па зьніжэньню сабекошту і падняцьцю вытворчасьці працы. Зрух ёсьць, яго трэба працягваць і ўвесь заводзкі колектыў напружана працуе над тым, каб свае абяцаньні выканаць поўнасьцю.

З. Мінкін.

„Вэзувій“ ізноў здае пазыцыі

Ново-Беліцкая сярнікова фабрыка «Вэзувій» прамфінплян у маі месяцы выканала па запалках на 89 проц. Гэта пасьля таго, як у сакавіку і ў красавіку выкананьне даходзіла да 100 проц. У нас ня здолелі замацаваць дасягнутага, што і прывяло да паморшчаньня і паменшаньня проценту выкананьня прамфінпляну ў маі месяцы. Многія падумалі так: **„хопіць з нас, можна адпачыць“.**

Адной з прычыны гэтага ёсьць слабасьць ударніцкага руху. На фабрыцы ўсяго каля 1400 чалавек ударнікаў. **Інжынэрна - тэхнічны пэрсонал таксама не на месцы. Ён нічога ня робіць у напрамку лепшай пастаноўкі работы ўдарных брыгад. Не глядзіць і за ходам работы на фабрыцы. У красавіку фабрыка стаяла 6 гадзін, фанэрны завод—8, дзякуючы таму, што сваячасова ня справілі дымаходу ў качагарцы.**

Варштаты адзін за адным выходзяць са строю таксама па віне тэхнічнай часткі. Няма клопату аб набыцьці запасных частак да варштатаў. У некаторых цэхах—здымальным, а часткова і ў накатным—прастоі ўвашлі ў сыстэму, цэхі прастойваюць па 3-4 гадзіны ў кожную пяціднёўку.

Шмат для каго фабрыка—прахадны двор. Да набору новай рабочай сілы адносяцца з прахладцам. Набіраюць каго папала. Прытуляюць нэпмана Калановіча, адмаўляюць у прыёме батрацы Кірхошчанка.

Ня выжыты прагулы. У накатальным цэху, напрыклад, на першы дзень вялікадня ня вышла на работу 10 чалавек. Нядбайнасьць, недысцыплінаваць-звычайныя зьявы на фабрыцы. Загадчык фанэрнага заводу—т. Вільнэр—на адным з партыйных сходаў нават заявіў—за **парушэньне працоўнай дысцыпліны трэ' было-б звольіць увесь фанэрны завод!** Часта адміністрацыя ня толькі не змагаецца з апушчэнствам і прагуламі, а нават падрымлівае іх. **Татарэнка Рыгор** прагуляў 4 дні, а заводакіраўніцтва прапанавала загадчыку цэху пакінуць яго на працы.

Дрэнна фабрыка забясьпечваецца сыравінай, яшчэ горш—скрыначны цэх паперай.

Далей гэтага цярпець нельга. Трэба, нарэшце, па - баявому ўзяцца за зьняцьце фабрыкі з чорнай дошкі. Гэта будзе лепшым падарункам 16 партыйнаму зьезду.

Н. Кесель.

НЯ ХАВАЙЦЕ ВЫНІКАЎ У КІШЭНЮ

Рабочыя „Зьвязды“ чакаюць прамфінпляну

Налётам „лёгкай кавалерыі“ на заводзе „Зьвязда“ (Капцэвічы) выяўлена, што рабочыя ня ведаюць свайго прамфінпляну. Да некаторых груп рабочых не даведзена нават і норма выпрацоўкі, а калі яна і даведзена, дык ніхто праверкай яе ажыцьцяўленьня не займаўся.

Адміністрацыя спрабавала давесьці прамфінплян да варштата, але выпрацавала яго так, што рабочы ня можа яго зразумець. Завком на гэта не зьвяртае ўвагі. Выяўленыя **налётам „лёгкай кавалерыі“** хібы нідзе не абгаварваліся, нібы таму, як матывуе кіраўнік „лёгкай кавалерыі“ тав. Васкабойнік, што завком ня вылучыў брыгады ў дапамогу „лёгкай кавалерыі“.

Нам здаецца, што бязьдзейнасьць завкому ня можа зьяўляцца прычынай і повадам пакінуць вынікі налёту нескарыстанымі. Іх трэба тэрмінова абгаварыць, як на завкоме, так і на вытворчай нарадзе з тым, каб хутчэй зьнішчыць выяўленыя недахопы.

Міхась.

Сталінградзкі трактарны завод

На здымку: Сямітысячніца комсамолка тав. Пятрова за працай ля такарнага варштату.

Ганьба дэзэртырам з вытворчага фронту

На нашай фабрыцы наглядаецца цяпер павялічэньне колькасьці колектываў. У матальным цэху—24 колектывы; вытворчасьць працы ў іх паднялася на 16 проц., палепшылася якасьць работы. Колектывы ў вязальным цэху ўзьнялі вытворчасьць працы на 3 проценты. У фарбавальна-арматурным 20 колектываў палепшылі якасьць сваёй работы на 100 процантаў.

Усяго на фабрыцы вытворчымі колектывамі ахоплена 147 чалавек. Большая частка з іх беспартыйная моладзь.

Аб значэньні колектываў у нас ня было належнай растлумачальнай работы, асабліва з боку комсамольскай ячэйкі. Дзякуючы гэтаму, сярод комсамольцаў назіраюцца моманты **адмаўляньня ісьці ў колектывы.** Напрыклад, комсамолка **Вайнштэйн** уступіла ў колектыў толькі пасьля некалькіх выклікаў на бюро ячэйкі. Комсамолка **Л...віна** катэгорычна адмовілася ўступіць у колектыў, мотывуючы тым, што ў колектыве будзе цяжка працаваць.

Трэба прыкласьці ўсе натугі, каб садзейнічаць далейшаму павялічэньню колькасьці вытворчых колектываў, палепшаньню іх работы.

Крапіва,

Віцебск, панчошная ф-ка імя К. Цэткін.

УЗБРОЙЦЕ РАБОЧЫХ ЛІЧБАМІ ПРАМФІНПЛЯНУ

На Менскай галянтарэйнай фабрыцы «Беларуска» прамфінплян да варштата не даведзен. Рабочыя ведаюць толькі сваю норму, а колькі павінна выпусьціць машына, або варштат, ніхто ня ведае. Прамфінплян вывешваецца кожную дзесяціднёўку, але ў ім не гаворыцца ні аб браку, ні іншых паказчыках, па якіх можна было-б бачыць, як выконваецца прамфінплян.

Нават самі брыгадзіры ня ведаюць аб прамфінпляне. Многія рабочыя зусім незнаёмы (асабліва новапрышоўшых) з соцдагаворамі. Заводзкія арганізацыі ня цікавіліся давядзеньнем прамфінпляну да варштата і да рабочага. Ударныя брыгады працуюць дрэнна таму, што яны не ашрымліваюць ніякага кіраўніцтва як з боку партыйнай, так і комсамольскай і профсаюзнай арганізацыі.

Рэзчык.

Алесь Блакітны

У партыю Леніна

Мы—ўдарнікі!
Мы дружныя брыгады
Заводаў, фабрыкаў!
Ад гучных варштакоў
З запалам творчасьці
І Ленінскім зарадам
Ідзем у Партыю
Пад рапарты гудкоў!

Ідзем мы цэхамі;
Нас тысячы!.. мільёны!..
Бурліць руччом у нас
Імклівасьці імпэт.
Ідзем у шэрагі
Магутнае калёны—
Калёны Леніна,
Пад сьцяг УсеКП!

Табе, Компартыя!
Даем мы абяцаньне
Ад сэрца чыстага
І цьвёрдага, як сталь!
Мы шляхам Ленінскім
У жорсткасьці змаганьня
Няўхільна крочыцьмем
У сонечную даль!

А тэмпы шпаркія
Ударамі памножым,
Упрыгожым юны край
У Пяцігодак цьвет.
Парогі, цяжкасьці
Зьдзяньнем пераможам!
Будовай буйнаю
Усьцелем часты сьлед.

І мы ўдарнікі!
Ад вежаў дымна-чорных
Ідзем у Партыю!
Сталёвы маем гарт.
Гучы індустрыя
Сугучнасьцю задорнай
Ідуць нас тысячы...
Ударніцкіх брыгад!

25-II—1930 г.

Завод „Пролетары“ сустракае зьезд партыі буйнейшымі прарывамі

Падрыхтоўку да зьезду праспалі

Шклозавод „Пролетары“ (Менск) да ХУІ партыйнага зьезду прыходзіць з шэрагам прарываў у вытворчасьці.

Май м-ц прывёс значнае пагоршаньне ў выкананьні прамфінпляну. Калі за першае паўгодзьдзе сабекошт быў зьніжан на 8,81 проц., то ў маі процант зьніжэньня складае 5,7%, тады як прамфінплян прадугледжвае 7,78 проц. зьніжэньня. Прамфінплян за май месяц у танажных адносінах выкананы на 94,4 проц., а ў грашовых—па 99,5 проц.

Апошнія месяцы далі павялічэньне прагулаў па няўважлівых прычынах. Калі раней сярэдні процант прагулаў не правышаў 0,35 проц. то ў маі месяцы ён складае 1,03 проц. З гэтай прычыны ёсьць цэлы шэраг прастояў варштатаў. Наладжаньню нормальнай працы перашкаджае адсутнасьць патрэбнай колькасьці кваліфікаваных рабочых.

„Гэроі“ чорнай дошкі

Ёсьць шэраг выпадкаў, калі моладзь і паасобныя комсамольцы з-за сваіх няўважлівых адносін да вытворчасьці зьяўляюцца ілжэўдарнікамі. На чорнай дошцы, якая вісіць у гуце, занесена 4 прозьвішчы: **Ахотнікаў, Шымкевіч, Мірановіч і Макарэвіч. Усе чацьвёра маладыя рабочыя.**

Нядаўна выключаны з комсамолу ілжэўдарнікі **Шымкевіч і Капілевіч.** Ячэйка выкрыла твар ілжэ-Ударніка з комсамольскім білетам—Капілевіча, які выступаў супроць соцспаборніцтва. Капілевіч аказаўся пазбаўленцам, уласьнікам 4 дамоў.

За чэрвень месяц намеціўся пералом у бок большай колькасьці выпрацоўкі ў гуце. Накаэчыкі за чэрвена месяц даюць поўную магчымасьць сьцьвярджаць, што прамфінплян за чэрвень месяц будзе поўнасьцю выкананы.

Што зрабілі партыйная і комсамольская ячэйкі па падрыхтоўцы да ХУІ партыйнага зьезду.

На заводзе праводзяцца заняткі па прапрацоўцы тэзісаў дакладаў на ХУІ партзьездзе. На гэтыя заняткі прыходзіць толькі 70—75 проц. комсамольцаў. **Комсамольцы слаба ўдзельнічаюць у распрацоўцы тэзісаў і амаль зусім ня выступаюць у спрэчках.**

Восемь маладых рабочых уступілі ў шэрагі комсамолу. Шэсьць комсамольцаў мяркуюць перадаць у партыю.

Комсамольская і партыйная ячэйкі гуты праспалі падрыхтоўку да зьезду. Яны не мобілізавалі рабочых на ліквідацыю дапушчаных прарываў у вытворчасьці.

А. Л.

Пытаньне аб організацыі лягеру 5 дня ўдарніка ВЫРАШЫЦЬ СЕНЬНЯ

нарада гаспадарнікаў і профэсыяналістых

Падрыхтоўчую працу да адчыненьня лягеру—правесьці ўдарнымі тэмпамі

Нашы прапановы да нарады

ЦСПСБ і ВСНГБ прызналі неабходным організацыю лягеру „5-га дня ўдарніка“ у садзе „Профінтэрн“

Цэлы шэраг сходаў ударнікаў, комсамольцаў і рабочых цалкам кадтрымліваюць нашу прапанову.

Лягер павінен быць організаваны на сродкі з фонду прэміяваньня ўдарнікаў і лепшым прэміяваньнем зьяўляецца організацыя культурнага адпачынку. Гэтыя сродкі знаходзяцца ў распараджэньні дзярж органаў нашай рэспубліканскай прамысловасьці.

Лягер павінен быць організаваны на два месяцы: з 11 ліпеня па 15 верасьня. За гэты пэрыод ён абслужыць 18 тысяч ударнікаў.

Для правільнай організацыі адпачынку, харчаваньня і культурнага абслугоўваньня кожны адпачываючы, па прыблізных падліках, будзе абыходзіцца у 3 руб. 20 к. у дзень. Сюды ўваходзіць харчаваньне—4 разы у дзень, экскурсіі за горад, катаньне на лодках, тэатр, кіно і г. д.

Кожны ўдарнік павінен уносіць па 1 рублю за аднадзённы адпачынак.

Такім чынам на долю грамадзкіх організацый прыпадае датацыя па 2 руб. 20 кап. на чалавека. Калі сюды дадаць аплату абслугоўваючага пэрсоналу, дык патрабуецца датацыя ад гаспадарчых організацый у 45 тысяч рублёў.

Калі ўлічыць, што за 45 тысяч рублёў мы абслужым культурным здаровым адпачынкам 18000 чалавек, дык бязумоўна, супярэчаньня да організацыі лягеру „5-га дня ўдарніка“ быць ня можа.

Склікаемая сёньня нарада прадстаўнікоў гаспадарчых, профэсыйных і грамадзкіх організацый павінна конкрэтна вырашыць пытаньне аб тым, хто якую суму ўносіць і як практычна будзе організаваны лягер.

Адразу пасьля нарады неабходна ўжо прыступіць да практычнага ажыцьцяўленьня гэтай справы, бо лягер павінен быць адчынен 11 ліпеня.

Ніжэй мы друкуем орыентовачны рэглямант адпачываючага ў лягеры „Пятага дня адпачынку“. Мы зварочваемся да ўсіх ударнікаў з заклікам абгаварыць гэты рэглямант і унесьці свае прапановы наконт лепшай організацыі адпачынку.

РЭГЛЯМАНТ:

1. *Збор лягеру—а 8 гадзіне раніцы.*
2. *Зарадкавая гімнастыка і сьнеданьне—ад 8 да 10 гадз.*
3. *Політпрасьветработа—ад 10 да 12 гадз.*
4. *Другое сьнеданьне—12—12 з пал. гадз.*
5. *Экскурсіі па гораду і за горад—12 с пал.—15 гадз.*
6. *Абед—15—16 гадз.*
7. *Мёртвы час—16—17 гадз.*
8. *Гадзіна самадзейнасьці—17—18 гадз.*
9. *Купаньне, катаньне на лодках—18—19 гадз.*
10. *Гульні, забавы—19—20 гадз.*
11. *Вячэра—20—21 гадз.*
12. *Тэатр, кіно—21—23 з пал. гадз.*

РАЗГАРАЕЦЦА ПОЛЫМЯ РЭВОЛЮЦЫЙНАЙ БАРАЦЬБЫ

т. війск\я матросы паўсталі. У горадзе Труа, дзе знаходзіцца турма Клерво, адбыліся мітынгі протэсту супроць рэпрэсій да зьняволеных комуністых

У Фінляндыі зачынены клюбы рабочай моладзі

„Сялянскі паход“ на Гельсінгфорс

Нарада фашысцкіх дэлегатаў

ГЕЛЬСІНГФОРС, 22. Адбылася нарада фашысцкіх дэлегатаў з розных мясцовасьцяй. На нарадзе было вырашана наладзіць „сялянскі паход“ на Гельсінгфорс. Нарада прыняла бурны характар, які патрабуе абгаварэньня ў сойме законапроекту аб „ліквідацыі комунізму“. Для паходу на Гельсінгфорс чыгуначнае кіраўніцтва прадстаўляе фашыстым 2 і 3 ліпеня 25 экстарных цягнікоў.

Масавыя звальненьні гарнякоў

ВЕНА, 22.—Па паведамленьню з Бухарэсту ў вугальным раёне даліны Жыля адбываюцца масавыя звальненьні гарнякоў, павялічэньне рабочага дня і зьніжэньне зарплаты. У шэрагу капальняў рабочы тыдзень скарочан да 3-х дзён.

Напады тубыльцаў на плянтатараў

ШАНХАЙ, 16. Друк Ціхаакіянскіх выспаў амаль штодзённа паведамляе аб нападзе тубыльцаў-рабочых на эўропэйцаў, уладароў плянтацый або наглядальнікаў. Звычайна тубыльцы па адным, альбо па двое-трое нападаюць на найбольш ненавісных эўропэйцаў-плянтатараў і сваёй прымітыўнай зброяй (цыворыкамі і іншымі нажамі, сякерамі, бамбуковымі палкамі і г. д.) жорстка іх зьбіваюць. Нярэдкі і сьмяротныя вынікі. Як паведамляе друк, гэтыя напады выклікаюцца жорстокасьцю эўропэйскіх плянтатараў і наглядальнікаў, фізычнымі пакараньнямі штрафамі і г. д.

У апошні час адзначаны выпадкі нападу на плянтацыі Сіліндо, плянтацыі Танджонг на Суматры і інш. мясцох.

Прапановы комуністычнай фракцыі рэйхстагу

БЭРЛІН, 18. — Комуністычная фракцыя ў рэйхстагу прапануе наступныя мерапрыемствы для пакрыцьця дэфіцыту бюджэту: устанаўленьне адначаснага падатку на маёмасьць звыш 500 мільёнаў марак ў памеры 50 проц., падатковае абкладаньне сем'яў прамысловых прадпрыемстваў з даходаў, якія перавышаюць 50.000 марак у год, спыненьне выдачы пэнсіі звыш 18.000 марак і функцыя вышэй 6.000 марак у год. Атрыманыя сумы павінны быць скарыстаны для дапамогі беспрацоўным, інвалідам, для організацыі аховы мацярынства і маладзенства, павышэньня заработнай платы рабочым і ніжэйшым катэгорыям дзяржаўных служачых.

Комуністычны атрад заняў 2 кітайскія гарады

ШАНХАЙ. Як паведамляе газэта „Герын-Жы-Бао“, комуністычны атрад у 3000 чалавек заняў гарады Лусяпа і Пыншы.

Прасьледваньні рабочы організацый ў Фінляндыі

Спынена двейнасьць клюбу рабочай моладзі ў Суруа.

ГЕЛЬСІНГФОРС, 12. На падставе **„закону аб таварыствах“** *пастановаю суда спынена дзейнасьць клюбу рабочай моладзі ў Суруа.*

Зачынен таксама клюб рабочай моладзі ў Куйваніемі—Мюльлякангас. У г. Баазе ўтвораны вобыскі ў рабочых В. Туомэла і А. Потты. Канфіскавана профсаюзная перапіска і ўвесь архіў ваазаскага цэнтральнага профсаюзнага савету.

Паўстаньне мараков у Батавіі

Арыштаваны кіраўнік паўстаньня.

ШАНХАЙ. 16. Газэта „Сінгапур Фры Прэс“ паведамляе, што ў адным з партоў Батавіі ўся каманда парахода „Блёмэрэдык“ паўстала, патрабуючы безадкладнай выплаты зарплаты. Паўстанцы пагражалі вышэйшаму камандному складу і капітану парахода. Ня глядзячы на прыбыцьцё паліцэйскіх для ўсьміраньня паўстаньня, яны на працягу двух дзён адмаўляліся приступіць к рабоце, затрымаўшы адыход парахода на двое сутак. Кіраўнік паўстаньня арыштаваны.

Павялічылі мыты на савецкі экспарт

ВАРШАВА, 22. У апошні час польскім міністэрствам гандлю і прамысловасьці прыняты шэраг мер для абмежаваньня і недапушчаньня савецкага экспарту ў Польшчу. На ўсе гатункі нафтапродуктаў, якія прывозяцца з СССР, павялічана мыта ў 2 з паловаю разы ў той час, як на нафтапродукты, прывозімыя з іншых краін, мыта засталася нязьменнай.

Дзень Чырвонага спорту будзе праведзены

БЭРЛІН, 21—Як паведамляюць з Базэля (Швэйцарыя) базэльская паліцыя забараніла дзень чырвонага спорту. Камуністычная партыя ІІІ-эй цары рыхтуецца да правядзеньня дня чырвонага спорту напэракор забароне.

Антыфашысцкая дэмонстрацыя ў Касэлі

БЭРЛІН, 22.—У сувязі з адбыўшайся ў Касэлі анты-фашысцкай дэмонстрацыяй, памяшканьне мясцовага сакратарыяту компартыі занята паліцыяй. Арыштавана 20 рабочых.

„Выкрыцьцё“ ахранкі

ВЕНА, 18. Як паведамляе румынская газэта „Універсул“ ахранка раскрыла нібыта новыя комуністычныя організацыі ў паўднёвай Бэсарабіі. Ахранка падазравае, што „ва ўсіх вёсках паўднёвай Бэсарабіі існуюць комуністычныя ячэйкі“.

Аб уборцы ўраджаю і ня думаюць

Ня глядзячы на тое, што вясеньняя пасеўная кампанія па Стайкаўскаму сельсавету (Аршаншчына) цалкам закончылась, колгасы, а таксама і індывідуальныя гаспадаркі не распачэлі яшчэ падрыхтоўчае працы да касавіцы і жніва. Колгасы яшчэ ня прыступілі да рамонту машын, конскай збруі і інш.

Комсамольская ячэйка і сельсавет ніякай работы не праводзяць сярод колгасьнікаў і індывідуальных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, каб сустрэць уборку падрыхтаванымі.

Ігрэк.

Паведамленьні

Заслаўскі РК КП(б)Б і ЛКСМБ паведамляюць, што 29-УІ—30 г. а 10-й гадзіне раніцы у мястэчку Заслаўе адбудзецца раённая нарада юнкораў, рабселькораў і насьценкораў і старшынь рэдколегій.

З наступным парадкам дню:

1. Задачы друку і рабселькораўскага руху ў сувязі з соцыялістычнай рэконструкцыяй. (Даклад прадстаўніка рэдакцыі „Чырвонай Зьмены“).

2. Праца колгасаў, уборачная асеньняя пасеўная кампанія, удзел у іх рабселькораў, юнкораў і насьценгазэт.

Заўтра, у 6 з паловай гадзіны ўвечары у памяшканьні Мен. АК ЛКСМБ склікаецца нарада агітатараў, вылучаных для ўдзелу ў масоўцы. Павінны зьявіцца т. т.: Грыб, Старобінец („Комунар“), Хейман („Акцябр“), Райхельсон (ФРК), Давідовіч (Друкарня), Касмовіч (ЦСУ), Левін (Медсанпрацы), Жаўрык (Працасьветы), Брыскін, Каган (Рабфак), Барысевіч (чыгунка), Каўнацкі („Энэргія“) і Ржэўскі (БДУ).

Мен. АК. ЛКСМБ.

Рэдакцыя газэты „Чырвоная Зьмена“, МенАК ЛКСМБ, ВСНГБ і ЦСПСБ склікаюць 26 чэрвеня, а 7-ай гадзіне ўвечары, ў памяшканьні залі пасяджэньня МенАК КП(б)Б, нараду прадстаўнікоў гаспадарчых аб'яднаньняў усіх ЦП саюзаў, Наркампрацы, Галоўсоцстраху, прадстаўнікоў гаспадарчых профэсыйных і комсамольскіх організацый наступных прадпрыемстваў: „Энэргія“, „Комунар“, „Бальшавік“, „Кастрычнік“, „Абутковая фабрыка“, „Дрэваапрацоўшчык“, „Чырвоная Зорка“, „Комунарка і „Беларуска“ па пытаньню.

Організацыі лягеру „5 га дня ўдарніка“ у садзе „Профінтэрн“.

Запрашаюцца ўдарнікі.

Просьба зьявіцца без спазьненьня.

Менск, друкарня БДВ імя тав. Сталіна

Адказны рэдактар Рэдкалегія

Галоўлітбел № 599